# „ХТО УЗНАЧАЛЬВАЕ ДЗЯРЖАЎНУЮ БІБЛІЯТЭКУ“

Пад такім загалоўкам у «Звяздзе» ад 14 верасня г. г. быў змешчан артыкул, у якім выкрываўся варожы твар былога дырэктара бібліятэкі і ўказвалася на цэлы рад абураючых фактаў шкодніцтва ў бібліятэчнай рабоце.

У артыкуле абвінавачваўся партком бібліятэкі ў палітычнай блізарукасці да шкодніцкай дзейнасці варожых людзей, якія арудвалі ў бібліятэцы.

У той-жа дзень партком склікаў сход партыйнай арганізацыі. Здавалася-б, што ўслед за такой аператыўнасцю ў скліканні схода паследуе і бальшэвіцкае рэагаванне на факты. Аднак гэтага не здарылася. Партыйны сход **«прызнаў артыкул «Звязды» правільным»** і на гэтым паставіў кропку. Больш таго, сакратар парткома т. Раманоўская, якая шмат чаго ведала аб шкодніцкай дзейнасці ў бібліятэцы і ніякіх мер не прымала, у сваім выступленні на сходзе дэмабілізавала комуністаў. Яна заявіла, што парткому і да артыкула ўсё было вядома, што партком, моў, аб усім гэтым сігналізаваў райкому і гаркому.

У такім-жа духу былі напісаны і вывады камісіі, якая абследвала становішча бібліятэкі. Бюро Сталінскага райкома з такімі вывадамі не згадзілася і прапанавала камісіі даследваць гэту справу. Пасля таго прайшло ўжо шмат часу. Але райком яшчэ нічога не зрабіў для таго, каб аздаравіць работу парторганізацыі бібліятэкі і дапамагчы ёй хутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцтва.